**192.** Да слоў з левага слупка падбярыце словы з правага слупка.

| | |
|---|---|
| Ружы ... . | *спявае* |
| Шпакі ... . | *чытае* |
| Хлопчык ... . | *цвітуць* |
| Дзіця ... . | *спіць* |
| Дзяўчынка ... . | *прыляцелі* |

Запішыце 3 сказы на выбар.

Пра каго гаворыцца ў кожным сказе? Падкрэсліце гэтыя словы адной рыскай. Што пра іх гаворыцца? Падкрэсліце гэтыя словы дзвюма рыскамі.

Узор. *Ружы цвітуць*.

**193.** Дапоўніце сказы патрэбнымі словамі.

... ловіць мышэй.
... растае́ вясной.
... лечыць людзей.

Спішыце сказы. Пра каго або пра што гаворыцца ў кожным сказе? Падкрэсліце гэтыя словы адной рыскай. Што пра іх гаворыцца? Падкрэсліце гэтыя словы дзвюма рыскамі.


Правообладатель Национальный институт образования

**Рм 194.** З асобных слоў складзіце сказы.

Коля, клас, спяшаўся, ў.

У, хлопчык, калідоры, настаўніцу, сустрэў.

Коля, ёй, з, павітаўся.

Запішыце сказы. Падкрэсліце словы, якія абазначаюць, пра каго гаворыцца ў сказе і што гаворыцца.

Назавіце ў сказах прыназоўнікі.

Якімі словамі можна вітацца з настаўніцай? З сябрамі?

*калідо́р*

**Гаварыце правільна**

Павітацца з настаўніцай, дзякаваць бабулі, даравацъ сябру.

**195.** Адкажыце на пытанні.

З кім павіталася Таня ў школе?





Правообладатель Национальный институт образования



Каму дзяўчынка хутка даравала крыўду?



Каму падзякавала Таня за смачную вячэру?



**196.** З асобных слоў складзіце сказы.

Увесну, пад, фіялка, расцвіла, ліпаю.
За, прыгожы, раскінуўся, домам, парк.

Запішыце сказы. Падкрэсліце словы, якія абазначаюць, пра што гаворыцца ў кожным сказе.

**197.** Размясціце радкі верша Ніны Галіноўскай «Хітры павучок» па парадку.

| | |
|---|---|
| 1. | На травінках павучок |
| ? | — Прылятайце, мухі, мошкі, |
| ? | выткаў тонкі гамачок. |
| ? | і пагушкайцеся трошкі. |



Правообладатель Национальный институт образования

Спішыце першы сказ. Назавіце ў ім словы, якія абазначаюць, пра каго гаворыцца ў сказе і што гаворыцца.

**198.** Расстаўце словы ў патрэбным парадку. Запішыце сказы.

Увесь, сонца, дзень, свеціць.
У, пабеглі, ручайкі, хуткія, дварах.

Падкрэсліце ў сказах словы, якія абазначаюць, пра каго або пра што гаворыцца ў сказе і што гаворыцца. У другім сказе назавіце прыназоўнік.

**199.** Прачытайце. Вызначце межы сказаў.

Надыходзяць ц..плыя дз..нькі св..ціць ласкавае сон..йка зазел..нела маладая траўка сп..ваюць галасістыя птушкі

Якія літары трэба ўставіць у словы? Растлумачце правапіс літар ***е, ё — я.***

Спішыце. Назавіце ў сказах словы, якія абазначаюць, пра каго або пра што гаворыцца ў сказе і што гаворыцца.



Правообладатель Национальный институт образования

**200.** Прачытайце прыказкі. Чаму так гавораць?

Лета збірае, а зіма праядае.
Лянок не любіць ляноты.

Колькі слоў у сказах? Спішыце сказ з чатырох слоў. Падкрэсліце ў ім словы, якія абазначаюць, пра што гаворыцца ў сказе і што гаворыцца.



**201.** З асобных слоў складзіце і запішыце сказы.

Дзеці, лес, прыйшлі, у.
Тут, ландышы, цвітуць.
Прыгожа, птушкі, спяваюць.

Падкрэсліце словы, якія абазначаюць, пра каго або пра што гаворыцца ў сказе і што гаворыцца.

**202.** Дапоўніце сказы па пытаннях і запішыце.

д з е?

Дрэвы растуць … .

я к а я?

Смяецца … дзяўчынка.



Правообладатель Национальный институт образования

к а л і?          я к і?

… пачаўся … дождж.

С л о в ы  д л я  д а в е д к і: *у лесе, маленькая, раніцай, моцны.*

Падкрэсліце словы, якія абазначаюць, пра каго або пра што гаворыцца ў кожным сказе і што гаворыцца.

Рм **203.** Вусна дапоўніце сказы тэксту па пытаннях.



Добра сонечным днём на вуліцы. Дзяўчынкі катаюцца (н а  ч ы м?) на … . Хлопчыкі гуляюць (у  ш т о?) у … . Малыя гушкаюцца (н а  ч ы м?) на … .

У другім сказе назавіце словы, якія абазначаюць, пра каго або пра што гаворыцца ў сказе і што гаворыцца.



Правообладатель Национальный институт образования

**204.** Прачытайце скорагаворку. Навучыцеся правільна вымаўляць яе.

1 2

**Стройныя кедры дрыжаць на ветры.** *(С. Шах.)*

Назавіце словы, якія абазначаюць, пра каго або пра што гаворыцца ў сказе і што гаворыцца.

Вусна пастаўце па стрэлках пытанні да астатніх слоў у сказе. Зрабіце гэта ў той паслядоўнасці, якую падказваюць лічбы над стрэлкамі.

**205.** Прачытайце.

**1. Каля клёна расце возера. 2. Павел выразна чытае верш. 3. Цікавая канапа ляжыць на кнізе. 4. Наташа намалявала прыгожую кветку.**

Назавіце сказы, у якіх дапушчаны сэнсавыя памылкі. Выправіце памылкі і запішыце сказы.

У запісаных сказах падкрэсліце словы, якія абазначаюць, пра каго або пра што гаворыцца ў сказе і што гаворыцца. Ад падкрэсленых слоў вусна пастаўце пытанні да астатніх слоў у сказах.



Правообладатель Национальный институт образования



**206.** Прачытайце. Вызначце межы сказаў.

Прыйшла вясна школьны сад стаіць у зялёным убранні лёгкі ветрык калыша дрэвы

Спішыце. Правільна афарміце сказы на пісьме.

Падкрэсліце словы, якія абазначаюць, пра каго або пра што гаворыцца ў кожным сказе і што гаворыцца. Вусна пастаўце пытанні да астатніх слоў у сказах.

## Адкажыце на пытанні

1. Што выражае сказ?
2. З якой літары трэба пісаць першае слова ў сказе?
3. Якія знакі прыпынку ставяцца ў канцы сказа?

Пры адказе на якія пытанні ўзніклі цяжкасці? На якой старонцы вучэбнага дапаможніка можна знайсці адказы на гэтыя пытанні?



Правообладатель Национальный институт образования